■ Каля люстэрка

# ШТО НАДЗЕЦЬ «ПАМПУШЦЫ»?

## Многія пышнацелыя жанчыны саромеюцца сваіх памераў. А дарэмна...

**Ва ўсе часы дамы рубенсаўскіх формаў лічыліся ўвасабленнем мацярынства і жаноцкасці. Праўда, сённяшнія каноны прыгажосці ствараюць для такіх жанчын шмат праблем, асабліва пры складанні гардэроба. Як правіла, найбольшы выбар адзення ў крамах прадстаўлены ў дыяпазоне 42—48 памеру, а тыя ўборы, што перавышаюць гэты памерны рад, часта выглядаюць бясформенна і мехавата. Тым не менш, выбраць прыгожае і моднае адзенне для поўных можна, і вельмі паспяхова, трэба толькі прыслухацца да парад стылістаў.**

✓ Перш за ўсё вам неабходна клапаціцца аб тым, каб адзенне дапамагала захаваць правільнасць прапорцый і гарманічныя суадносіны частак цела. Таму варта крытычна ацаніць сябе і дакладна абазначыць свае праблемныя зоны.

✓ Не купляйце адзенне на памер—два большае, шырокае ці «балахоністае». Не трэба думаць, што яно схавае паўнату. Наадварот, бясформеннасць робіць фігуру яшчэ больш масіўнай і аб'ёмнай. Вялікі памер адзення проста абавязвае акцэнтаваць увагу на лініі таліі. Гэта дазваляе зрабіць сілуэт збалансаваным, нават у тым выпадку, калі сама талія далёкая ад запаветных 60 сантыметраў (дарэчы, каб падкрэсліць талію, выкарыстоўвайце тонкія (!) рамяні).

✓ Не верце тым, хто сцвярджае, што набывае адзенне без прымеркі. Так не бывае: нават на манекеншчыц са стандартнымі «90-60-90» кожную сукенку падганяюць. Таму, каб выбраць, трэба прымяраць, прымяраць і яшчэ раз прымяраць.

✓ Выбірайце матэрыялы дастаткова эластычныя, якія свабодна аблягаюць цела. Яны робяць фігуру больш роўнай, згладжваючы яўныя пераходы паміж рознымі часткамі цела. Штаны і спадніцы варта выбіраць з непразрыстых, шчыльных па фактуры тканін. Такія рэчы на поўнай фігуры «сядзяць» практычна ідэальна. Пазбягайце бліскучых, з пералівам тканін, матэрыялаў занадта мяккіх і рэльефных — усе яны маюць уласцівасць візуальна паўніць. Такім жа эфектам валодаюць і тканіны ў шырокую папярочную палоску і буйную клетку. Лепш выкарыстоўвайце вертыкальныя або дыяганальныя палосы, якія, дзякуючы аптычнай ілюзіі, «выцягваюць» ваш сілуэт.

Асобна трэба вылучыць тонкі эластычны трыкатаж: жанчынам «з аб'ёмамі» ён катэгарычна супрацьпаказаны. Асаблівасць гэтага матэрыялу — яго здольнасць падкрэсліваць кожны «валік», кожную складачку на вашым жываце, а часам і спіне.

✓ Даўно вядома, што чорны колер і цёмныя адценні хаваюць недахопы фігуры. Аднак не варта абмяжоўваць сябе занадта моцна: можна смела выбіраць рэчы яркіх, сакавітых і глыбокіх колераў. Што да малюнка на тканіне, то выкарыстоўвайце дробны, нескладаны малюнак з жыццярадаснымі акцэнтамі (анімалістычны ці кветачны прынт, рознакаляровая палоска).

✓ У гардэробе кожнай «пампушкі» проста абавязана быць якасная бялізна для карэкцыі фігуры. Эластычныя калготкі, штонікі згладзяць лінію таліі і паменшаць клубы ў аб'ёме, «грацыя» прыпадыме грудзі. Адзенне на такой бялізне будзе лепш «сядзець». Галоўнае правіла пры выбары сподняй бялізны — мадэль не павінна нічога пераціскаць.

✓ Ідэальным фасонам сукенкі для «пампушак» можна лічыць суцэльнакроеныя сукенкі з падоўжнымі вертыкальнымі лініямі. Візуальна яны выцягваюць фігуру, адначасова робячы яе больш стройнай. Старайцеся падбіраць фасоны і камбінацыі рэчаў, якія ствараюць гэтыя самыя вертыкальныя лініі. Выдатна падыдуць фасоны з падоўжанымі лініямі, якія сфарміраваны планкамі, бейкамі, кантамі.

Жанчынам з праблемамі ў вобласці жывата і клубоў рэкамендаваны сукенкі з завышанай лініяй таліі.

**Пазбягайце бліскучых, з пералівам тканін, матэрыялаў занадта мяккіх і рэльефных — усе яны маюць уласцівасць візуальна паўніць.**

Сукенкі-падманкі таксама нібыта створаны для поўных жанчын: цэнтральная частка вырабу павінна прыцягваць увагу і быць цямнейшай, чым бакавыя светлыя элементы, якія быццам «раствараюцца» ў прасторы. Дзякуючы гэтаму прыёму фігура жанчыны здаецца больш зграбнай.

✓ Дамы з пышнымі формамі чамусьці рэдка носяць спадніцы. І дарэмна!

Для жанчыны з шырокімі клубамі падыдзе спадніца, якая звужаецца ўніз: спадніца-аловак, спадніца-цюльпан. Калі ж да клубоў дадаецца жывоцік, патрэбна крыху змененая варыяцыя «алоўка» — з завышанай таліяй. Жанчынам з вялікімі грудзямі і параўнальна вузкімі клубамі стылісты рэкамендуюць спыніцца на спадніцы-«паўсонца». Добра выглядае на пампушках і спадніца-гадэ. А вось пра «міні», шырокія расклёшаныя спадніцы лепш забыцца. Калі ж вам вельмі захочацца паэксперыментаваць, то можна спыніць выбар на спадніцы з асіметрычным кроем.

Ёсць і тут адно непарушнае правіла: у спадніцы абавязкова павінен быць чахол або падкладка. Гэта маленькая дэталь дапаможа вырабу лепш «сесці», пазбегнуць непатрэбных складак.

Што датычыцца даўжыні, то даўжыня «да падлогі» — гэта не самы лепшы варыянт для пышнацелых дам. Выключэнне можна зрабіць толькі для вячэрніх сукенак. У штодзённым жыцці аддавайце перавагу традыцыйнай даўжыні — да сярэдзіны калена або крыху ніжэй за калена.

✓ Калі гаварыць пра штаны, то ваш выбар — штаны-клёш ад сцягна (клёш сярэдні). Штаны ў абцяжку або шчыльныя легінсы ў спалучэнні з тунікай дапускаюцца, калі вашы ногі ад сярэдзіны сцягна дастаткова стройныя і маюць прывабную форму (дарэчы, туніка гэта не толькі модная рэч у жаночым гардэробе, але яшчэ і спосаб схаваць лішнія кілаграмы).

Удала выглядаюць на поўнай фігуры і штаны прамога крою. Пры гэтым яны павінны аблягаць, але не абцягваць фігуру, а таксама не надта звужацца ў вобласці калена. Выцертыя пасярэдзіне кожнай калашыны джынсы — таксама нядрэнны варыянт. Візуальна гэта дазваляе зрабіць ногі больш стройнымі, факусіруючы ўвагу на сярэдзіне нагі і адводзячы ў цень праблемныя зоны па баках.

Забудзьце пра капры, ультракароткія шорты, джынсы з нізкай пасадкай!

✓ Асаблівую ўвагу звярніце на вобласць дэкальтэ. На дамах з пышным бюстам добра выглядаюць фасоны адзення з запахам, якое ўтварае V-падобны выраз. Круглы выраз, выраз «лодачка» пераважныя для ўладальніц прыгожай шыі і падбародка, а вось каўняра-стойкі, які ўкарочвае шыю, «пампушкам» наогул трэба пазбягаць.

Мноства рушаў, іншыя аб'ёмныя дэкаратыўныя элементы зробяць пышны верх яшчэ больш аб'ёмным. А вось буйны дэкаратыўны элемент, які выступае сола, напрыклад, брошка ў выглядзе кветкі, выдатна падыдзе, паколькі будзе прыцягваць увагу да сябе.

✓ Каб схаваць паўнату рук і візуальна не ўкарочваць іх, рукавы лепш выбіраць даўжынёй да локця або 3/4. Доўгія і празрыстыя рукавы таксама прымальны варыянт.

Пад забаронай рукавы-ліхтарыкі, якія пашыраюць лінію плячэй.

✓ Падчас выбару адзення пазбягайце складак, плісэ, буйных накладных кішэняў, рушаў і валанаў, шырокіх паясоў. Такія ўпрыгажэнні могуць згуляць злы жарт з вашым аблічам, надаўшы пышным формам непатрэбны дадатковы аб'ём. Аксесуары таксама не павінны быць масіўнымі. Пацеркі ў адну доўгую нітку, маленькі шалік на шыі, тонкія бранзалеты, невялікая сумка на плячы нададуць вашаму вобразу асаблівую вытанчанасць і лёгкасць. Забудзьце і пра разнастайныя хусткі на плячах, паланціны і шалі — наўрад ці яны зробяць вас больш стройнымі. А вось элегантны негрудасткі абцас «выцягне» ваш сілуэт. Падняўшы сябе на некалькі сантыметраў і ўлічыўшы ўсе нюансы, вы ператворыцеся ў пышнагрудую красуню з выразнай таліяй і шыкоўнай лініяй сцёгнаў.

**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ**

■

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

# ЁСЦЬ ПЫТАННІ...

Я пачынаю гэты запіс, седзячы за сталом у сваёй кухні красавіцкім вечарам 2014-га ад Нараджэння Хрыстовага (лічу патрэбным удакладніць, што душа мая па прыродзе сваёй хрысціянка — менавіта таму ёй не вельмі даспадобы муштраваць сябе і цела праглядам тэлевізара, а куды цікавей рабіць справу, хай сабе і такую вось «крамзолістую»). Сяджу, значыць, у кухні, на канапе, якая па міласці гаспадара майго колькі часу яшчэ будзе заставацца цалкам у маім распараджэнні. А ўсё дзякуючы блешням, якія тэрмінова (рыбалка ж на носе!) запатрабавалі рэвізіі — і каб яе, рэвізію, правесці, трэба тыя самыя «колькі часу» аддаць (канапе здрадзіўшы) іх высокасці антрэсолям. Ён, гаспадар мой, завіс на табурэце перад сваімі палічкамі, а ў мяне за спінай — свае: з гаршчочкамі-гарлачыкамі, плеценымі кошыкамі, драўлянымі лыжкамі і розным на тое падобным. Наш сусед знізу (жывём мы на шостым паверсе) казаў неяк, што ў нашай кухні — як у тых Дудутках. У якіх «тых» — мы не ўдакладнялі: вядома ж, Дудуткі ў нас адны на ўсіх. Але напішу вось тут зараз, што ў нас мо і лепей, чым у тых Дудутках. Бо ўсё, па-першае, сваё, спадчыннае, а падругое, жывое — на службе штодня. Акрамя, што праўда, вілак. Яны прычэплены пад паліцамі, а не стаяць ля «печы», але гэта з той толькі прычыны, што я не выцягваю з іх дапамогай з духоўкі чыгункі (ну, неяк не прыстасавалася). Але гэтыя вілкі маюць пэўную місію! Яны трымаюць на сваёй драўлянай назе... Чаго толькі не трымаюць! Гліняныя медальёны з тых самых Дудутак губляюцца на іх між іншымі — з Нясвіжа, з Гародні, з Заслаўя, з Гальшан... Дзе былі — паўсюль набывалі.

Дарэчы, слухала неяк, тут якраз, у кухні, навіны. Маўляў, аграсядзіб у нас становіцца ўсё больш. І гэта, маўляў, надта ж добра. Яно, напэўна, так і ёсць, бо дзе гарадскому чалавеку прытуліцца, каб адчуць карані — калі не асабістыя, дык хаця б генетычныя? Але! Тут, як той казаў, ёсць адно «але». Прытым, што ўзрастае цікавасць да такога кшталту побыту — шляхецкага ці сялянскага, цікавасць да ўласна вёскі — жывой, аўтэнтычнай — ані не ўзрастае. І нават на плыву не трымаецца. Вось штучна створанае — захапляе, а пракаветна сапраўднае — не. Парадокс парадоксаў.

— Што ты пра ўсё гэта думаеш? — пытаю Яго, пана-гаспадара, які за час маіх разважанняў паспеў і блешні перабраць, і гаспадарку сваю — малюскаў ды крэветак — пералічыць, пакарміць, дагледзець.

— А дзе ты цяпер вёску бачыла? — адказвае мне Ён пытаннем на пытанне. Галава! Не раўня шыі.

І праўда: дзе?

Ледзь не кожны выхадны туды накіроўваючыся, ніколі, дальбог, не трапляю. Бо чым сённяшняя вёска адрозніваецца ад пасёлкаў, складзеных з катэджаў і прыватных дамкоў, што раскіданы па ўскрайках майго мегаполіса? Дзе сёння ранкам галосіць певень? Хіба што дзе-нідзе (так і хочацца першае паўслоўка з гэтых двух да злучка прывязаць, бо адваліцца). Дзе чуваць, як цурчыць малако ў даёнку? Няма ўжо такога паняцця — даёнка. Дзе бабкі на лаўках? — лавак няма. Няма, скажу я вам, нават катоў прыстойных. Каб сядзелі, вяршкоў налізаўшыся, на печы, скручваліся ў «шапку» на мароз і расцягваліся ўздоўж канапы на добрае надвор'е, каб мыліся як след перад прыходам госця і вуркталі ад задавальнення. Няма катоў — адны «мадэлі» для выставак. Бо кату, каб катом звацца, патрэбны печ, вяршкі і мыш пад венікам замест шчоткі ад пыласоса.

Нешта перакулілася ў гэтым свеце. Але што, які збан дакладна не вытрываў канкурэнцыі з трохлітровікам, — не ведаю.

Напэўна, усё ж такі цудоўна, што аграсядзіб у нас стала больш. Але тут — свая тэма: адпаведнасць формы зместу і зместу месцу. Дакладней, не зусім адпаведнасць або нават зусім не адпаведнасць — а яе, адпаведнасці, поўная адсутнасць. Ну які мне, каб хто сказаў, сэнс збірацца на выхадныя ў «Фальварак Тызенгаўза», калі Тызенгаўза я там не пабачу?

А хацелася б — ёсць пытанні...

■

■ Матуліны занатоўкі

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ

Ну вось, і з намі такое адбылося...

— Антон, у садок спознімся! — прыспешваю я малога.

— Не, мама, давай лепш прыдумаем іншую ідэю...

Безумоўна, і ў кніжках, і ў інтэрнэце я не раз чытала пра тое, што дзіця з часам можа адмовіцца хадзіць у садок, нават калі адразу ніякіх праблем з наведваннем гэтай установы не ўзнікала. Але чамусьці была ўпэўнена, што нас падобнае абміне. Дык самаўпэўненасць рэдка застаецца без пакарання...

Насамрэч праблема ў нас была зусім не ў садку. Дакладней, не зусім у садку. Напярэдадні Антонаў бацька зноў з'ехаў у сваю працяглую камандзіроўку. І сын, ужо ведаючы, што тату ён пабачыць няхутка (звычайна гэта месяцы праз тры-чатыры), як толькі мог, пачаў выказваць пратэст. Адмаўляцца спаць, есці, гуляць, апранацца, чысціць зубы... А цяпер яшчэ і наведваць садок.

**У сына, мяркуючы па ўсім, пачаўся славуты «крызіс трох гадоў». Размаўляць па-людску ён амаль перастаў, на ўсе выпадкі пакінуўшы сабе ўсяго тры фразы.**

Мужавы камандзіроўкі дагэтуль застаюцца праблемай, знайсці вырашэнне якой я ніяк не магу. Ні маляванне календароў пад дэвізам «чакаем тату», ні штодзённыя сюрпрызікі, якія муж быццам перадае для Антона разам з пілотамі самалётаў і капітанамі караблёў, ні іншыя мае прыдумкі — нічога не працуе. Сыну проста дрэнна. Па-сапраўднаму, па-даросламу дрэнна. І прызвычаіцца да гэтай, ужо даволі звычайнай сітуацыі ў нашым жыцці, ён ніяк не можа. Але ж у нас крэдыт за кватэру і розныя, пакуль мала яму зразумелыя, дарослыя «абавязацельствы»...

Як правіла, тыдні праз тры сынава жыццё (і маё адпаведна) пачынае наладжвацца. Трэба толькі набрацца цярпення. Але да сітуацыі з садком я ўсё ж не была гатовая.

Да пэўнага моманту Антон там не ствараў праблем нікому. Але калі першы раз зароў, патрабуючы тату, выхавальніца патэлефанавала мне і прапанавала яго забраць. Калі я прыйшла, яна раздражнена ўпікала Антошку: «Сціхні! Не палохай дзяцей!» Сын, на якога ніколі не павышалі голасу, роў яшчэ гучней... І вось цяпер ён катэгарычна не жадае ісці да «злой Кацілаўны» (Кацярыны Мікалаеўны). І няважна, што яна, магчыма, была галодная і не выспалася (так я спрабую патлумачыць Антошку яе незадаволенасць) — дараваць ёй ён не хоча.

«Кацілаўне» я таксама спачуваю. Надвор'е наладзілася, дзеці перасталі хварэць, яна ж — адна, ніякай нянечкі ёй у дапамогу ў нашым садку няма. А ты паспрабуй накарміць і апрануць-распрануць 20 малых адначасова...

Значыць, трэба перацярпець і гэта, вырашыла я. І ў садок мы не пайшлі... Штодня я прапаноўвала сыну распавядаць пра «садзікаўскіх» сяброў і цацкі, з якімі ён там гуляў. Разам з ім згадвала пра дзятлаў і вавёрак, якія жывуць на дрэвах вакол садка, пераглядала мультфільм пра хлопчыка Камарова і кіно пра «вусатага няня»... Калі дакладна, дык усё гэта мы рабілі не ўдваіх, а ўтраіх, разам з лялькай Машай, асобай надзвычай капрызлівай. Вось тут я не цырымонілася, нарэшце дазволіўшы сабе рабіць з лялькай усе тое, што мне хацелася зрабіць з Антонам, калі сілы трываць ягоныя капрызы былі на зыходзе... Гульня сыну вельмі спадабалася. І недзе праз тыдзень «Кацілаўне» было даравана.

А яшчэ праз тыдзень у сына, мяркуючы па ўсім, пачаўся славуты «крызіс трох гадоў». Размаўляць па-людску ён амаль перастаў, на ўсе выпадкі пакінуўшы сабе ўсяго тры фразы.

— Антон, нельга малаціць паравозам па люстэрку, яно можа разбіцца.

— А я хачу!

— На вуліцы лужыны, калі ласка, абуй боцікі.

— Не хачу!

— Давай, я дапамагу табе дастаць гэты самалёт.

— Я сам!

І караскаецца на збудаваную ім піраміду са стала, крэсла і кубіка, каб дацягнуцца да цацачнага самалёта, прычэпленага да жырандолі... Добра, я не перашкаджаю. Толькі на ўсялякі выпадак далёка не адыходжу... Потым паказваю яму шрам на руцэ, які ў мяне застаўся на памяць пра разбітае бабуліна люстэрка (насамрэч гісторыя са шрамам была іншай, але да яе, магчыма, яшчэ дойдзе)... У шкарпэтках Антон нават да бліжэйшай лужыны не дабіраецца, хаця я, прыхапіўшы з сабою невялічкую коўдру, вельмі на гэта разлічвала... Урэшце я пачынаю паводзіць сябе, як Аліса ў Залюстроўі, прапаноўваючы Антошку зусім не тое, што мне ад яго трэба. І ўвесь час мы змагаемся то з драконамі, то з «бамбукамі», якія грунтоўна дапамагаюць сыну (і найперш мне) зрабіць процьму не самых прыемных і не надта вясёлых спраў...

Завітаўшы да нас у госці, мой бацька зазначае:

— У вас тут проста вар'ятня нейкая.

Ды не, вар'ятня — гэта калі дзіця бясконца плача і ные, а ў нас — тэатр!

Цяпер штораніцы сын горда бяжыць у садок, у гэтае цудоўнае месца, куды дарослым уваход забаронены. Маіх сціплых акцёрскіх здольнасцяў хапіла, каб ён выдатна засвоіў, што там — толькі яго тэрыторыя, не мая і не татава... І мне шчыра шкада Танюшку, якую прыводзяць у садок амаль заўжды ў той жа час, калі туды заяўляемся мы з Антонам. «Калі ты будзеш зваць маму, выхавальніца зробіць табе ўкол. А калі будзеш плакаць, па цябе ніхто не прыйдзе», — застрашваюць яе дарослыя кожны раз...

Не памятаю, дзе я гэта прачытала, але есць думка, быццам «крызіс трох гадоў» — рэпетыцыя больш сур'ёзнага падлеткавага крызісу. Маўляў, наколькі ўдала бацькі здолеюць паразумецца з малечай, якая ўпершыню ўсведамляе сваю самастойнасць, настолькі ж гладка (ці нягладка) будуць складвацца пазнейшыя адносіны з іх «калючым» падлеткам. Не ведаю, як і што будзе складвацца ў нас надалей, але падсцяліць саломкі загадзя я не супраць.

Дарэчы, яшчэ раз пра кніжкі. Імкнучыся захаваць сваё і сынава псіхічнае здароўе (сваё — у першую чаргу), рознай педагагічнай літаратуры і інтэрнэт-форумаў з калектыўным досведам я праглядаю сапраўды шмат і пастаянна. Дык вось, самае разумнае і дзейснае, што траплялася мне дагэтуль у сучасных замежных аўтараў і так званай «сусветнай павуціне», ёсць у кніжках аднаго не надта сучаснага і не надта замежнага аўтара. Я пра Антона Макаранку, парады якога, здаецца, узялі на ўзбраенне самыя папулярныя сучасныя псіхолагі...

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

■

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

*220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А*

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв – 13.00–14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

**Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 22.04.2014 № 174 «О мерах по завершению строительства жилого дома» объединение осуществляет (завершает) строительство 7-10 секций жилой части объекта «Многоквартирный жилой дом № 10 по генплану по ул. Притыцкого в комплексе с многоярусной автостоянкой» (далее – объект строительства).**

Земельные участки общей площадью 1,8982 га предоставлены на основании решения Мингорисполкома от 20.02.2014 № 398 «Об изъятии, предоставлении земельных участков».

Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Жилой дом запроектирован 16-этажным, имеет техническое подполье и теплый чердак. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – декабрь 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 25.05.2007 № 1198-5/07 (с дополнением от 26.03.2014 № 145-15/14).

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир №№ 285, 286, 290, 330, 340, 357, 361, 362, 363, 364, 365, 366, 368, 379, 384, 385, 390, 391, 397, 402, 403, 408, 414, 415, 420, 421, 422, 423, 428, 433, 436, 440, 444, 452, 456, 457, 458, 459, 460.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

1-комнатные квартиры – 1 700 долларов США,
2-комнатные квартиры – 1 650 долларов США,
3-комнатные квартиры – 1 600 долларов США.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Договор строительного подряда от 17.02.2014 № 43/26-2014, генподрядчик – ОАО «Строительный трест №4».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*



УНП 690019195

К сведению акционеров
ОАО «Современные розничные технологии».
Предложение о выкупе (покупке) акций:
ТЕКСТ ПРЕДЛОЖЕНИЯ ЭМИТЕНТА О ВЫКУПЕ АКЦИЙ ПО ТРЕБОВАНИЮ АКЦИОНЕРОВ

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения эмитента-покупателя акций | Открытое акционерное общество «Современные розничные технологии», Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб. 106 |
| Количество акций, которое эмитент-покупатель намеревается приобретать | 20 000 шт. акций (общая сумма денежных средств, направляемых Обществом на выкуп акций по требованию его акционеров, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного общества на дату принятия настоящего решения, определяется на основании данных бухгалтерского учета); |
| Общее количество размещенных (не принадлежащих эмитенту) акций | 3 425 892 шт. |
| Цена приобретения акций | 35 926 рублей |
| Цель приобретения акций | Аннулирование |
| Вид, категория приобретаемых акций | Простые (обыкновенные) акции. |
| Место совершения сделок | Минский район, Хатежинский с/с, 1, административно-бытовой корпус, каб.106 (внебиржевые сделки) |
| Сроки (даты начала и окончания покупки акций), форма и порядок оплаты акций | Подача акционерами заявлений с требованием о приобретении Обществом акций, прием заявлений осуществляется в период: с 16.05.2014 по 25.05.2014 (включительно). Заключение договоров купли-продажи акций и оплата стоимости акций осуществляется в период: 26.06.2014 года по 04.06.2014 (включительно). Акции оплачиваются денежными средствами: безналичный (перевод на счета акционеров) и/или наличный (выплата из кассы организации) расчет. Расходы, связанные с оформлением и исполнением договора, несет акционер. |
| Настоящее предложение может быть отозвано в случае не представления в установленный срок ни одного требования (предложения) акционеров о выкупе акций. | |



**И З В Е Щ Е Н И Е**

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**

**объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану» в г. Минске,** ***опубликованную в газете «Звязда» 7 декабря 2012 года:***

**Ожидаемый ввод нежилого помещения общественно-бытового назначения № 2 в эксплуатацию – 1 июля 2014 года.**

Генеральный директор Н.В. Милошевский

УНП 100071325



**И З В Е Щ Е Н И Е**

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**

**объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом),** ***опубликованную в газете «Звязда» от 10 мая 2013 года № 85 (27450):***

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений №№ 54, 56, 58, 66, 69, 75, 78, 84, 94, 104, 114, 118, 124, 125, 129, 134, 136, 149, 154, 159, 164, 174, 175, 179, 184, 185, 189, 194, 195, 198, 199, 205, 209, 215, 219, 226, 229, 239, 245, 248, 249 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 3-комнатные квартиры – 1300 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1400 долларов США, 1-комнатные квартиры – 1350 долларов США.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 1-комнатных квартир №№ 47, 53, 57, 77, 107 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: – 1450 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325